Веснік БДУ. Сер. 3.2016. № 1. С. 14

*УДК 94(476)*

# АДРАДЖЭННЕ ПРАДПРЫМАЛЬНІЦТВА І ПАЧАТАК СТАНАЎЛЕННЯ НЕДЗЯРЖАУНАГА СЕКТАРА ЭКАНОМІКІ Ў БЕЛАРУСІ (1987-1991)

***П. А. ЖЫЛІНСКІ'****

[1]**Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

Разілядаецца адзін з маладаследаваных бакоў гісторыі суверэннай Рэспублікі Беларусь: на падставе прававых актаў і афіцыйных дакументаў, статыстычнай інфармацыі і матэрыялаў перыядычнага друку асвятляецца праблема адраджэння прадпрымальніцтва і станаўлення недзяржаўнага сектара эканомікі Беларусі; закранаюцца некаторыя аспекты фарміравання шматукладнай эканомікі, развіцця новых форм гаспадарання, працэс трансфармацыі інстытута ўласнасці. Раскрываюцца сутнасць перабудовачнага прадпрымальніцтва ў Беларусі, яго характэрньм рысы, прычыны станаўлення ў спецыфічных для тых гадоў формах, успрыманне гэтых працэсаў у грамадстве. Акрэслены асноўныя кірункі развіцця гарадскога і сельскага прыватнага сектара на стадыі пераходу да рынкавых адносін. Адлюстравана эвалюцыя прававой асновы акрэсленых змяненняў.

***Ключавыя словы:*** прадпрымальніцтва; палітыка перабудовы; недзяржаўны сектар эканомікі; кааператыў.

# ВОЗРОЖДЕНИЕ ПРЕДПРИНИМАТЕЛЬСТВА И НАЧАЛО СТАНОВЛЕНИЯ НЕГОСУДАРСТВЕННОГО СЕКТОРА ЭКОНОМИКИ В БЕЛАРУСИ (1987-1991)

***П. А. ЖИЛИНСКИЙ***

*^Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Республика Беларусь*

Рассматривается одна из малоисследованных сторон истории суверенной Республики Беларусь: на основе правовых актов и официальных документов, данных статистики и материалов периодической печати освещается проблема возрождения предпринимательства и становления негосударственного сектора экономики Беларуси; затрагиваются некоторые аспекты формирования многоукладной экономики, развития новых форм хозяйствования, процесс трансформации института собственности. Раскрываются сущность перестроечного предпринимательства в Беларуси, его характерные черты, причины становления в специфических для тех лет формах, восприятие этих процессов в обществе. Очерчены основные направления развития городского и сельского частного сектора на стадии перехода к рыночным отношениям. Отражена эволюция правовой основы данных изменений.

***Ключевые слова:*** предпринимательство; политика перестройки; негосударственный сектор экономики; кооператив.

# REVIVAL OF ENTREPRENEURSHIP AND START OF FORMATION OF THE NON-STATE SECTOR IN THE ECONOMY OF BELARUS (1987-1991)

***P. A. ZHYLINSKI****

*[z]Belarusian State University, Nezavisimosti avenue, 4, 220030, Minsk, Republic of Belarus*

**Образец цитирования:**
Жылінскі П. А. Адраджэнне прадпрымальніцтва і пачатак станаўлення недзяржаўнага сектара эканомікі ў Беларусі (1987-1991) // Весн. БДУ. Сер. 3, Гісторыя. Эканоміка. Права. 2016. № 1. С. 14-18.

**For citation:**
Zhylinski P. A. Revival of entrepreneurship and start of formation of the non-state sector in the economy of Belarus (1987-1991). *Vesnik BDU. Ser. 3, Gistoryja. Jekanomika. Prava.* 2016. No. 1. P. 14-18 (in Belarus.).

**Автор:**
***Петр Андреевич Жилинский*** - аспирант кафедры истории Беларуси нового и новейшего времени исторического факультета. Научный руководитель - академик НАН Беларуси, доктор исторических наук, профессор М. П. Костюк.

**Author:**
***Piotr Zhylinski,*** postgraduate student at the department of modern and contemporary history of Belarus, school of history.
*zhilinski@tut.by*

The article covers one of poorly explored areas in the history of the independent Republic of Belarus. Based on legislative acts and official documents, statistics data and media materials the article reports on the revival of entrepreneurship and start of formation of the non-state sector in the economy of Belarus in the last years of the Soviet Union. The article touches upon formation of mixed economy, development of new economic relations, transformation in the institution of property. The author discloses the nature of entrepreneurship during perestroika in Belarus, its main characteristics, reasons for its development in forms specific for those times, and public perception of those processes. The article also covers the main development areas of private sector in cities and the countryside on the initial stage of transition to market relations, including processes of privatization, attraction of foreign investment, and evolution of lease relations. The text reveals evolution of legal base for such transformations.

***Key words:*** entrepreneurship; politics of perestroika; non-state sector in economy; cooperative.

Адным 3 важных складнікаў працэсу перабудовы ў сацыяльна-эканамічнай сферы стала аднаўленне недзяржаўнага секгара эканомікі, які фактычна адсутнічаў у савецкай дзяржаве на працягу дзесяцігоддзяў. У часы перабудовы пачалося фарміраванне шматукладнасці саюзнай і беларускай эканомікі, развідцё новых форм гаспадарання, быў запушчаны працэс трансфармацыі інстытута ўласнасці.

Ва ўмовах крызісных з'яў, пгго назіраліся ў савецкай эканоміцы ў 1980-я гг., паўставала пытанне аб сродках пераад ол ення крызісу. Найболып праблемнымі заставаліся галіны вытворчасці тавараў народнага спажывання і сфера паслуг. Выправіць сітуацыю можна было з дапамогай развіцця прадпрымальніцтва. Паступовае адраджэнне прыватнага сектара, на думку «бацькоў» перабудовы, павінна было адкрыць савецкі рынак для прыцягнення замежных капіталаўкладанняў. Развіццё прадпрымальніцтва, замежныя інвестыцыі, інтэграцыя ў сусветны рынак мусілі стаць галоўнай умовай павышэння канкурэнтаздольнасці савецкіх прадпрыемстваў. Пры ажыўленні рынкавых адносін дзяржаўным прадпрыемствам давялося б паляпшаць сваё становішча і падцягвацца да прыватных арганізацый. Такія мерапрыемствы паскорылі б працэс рэфармавання эканомікі, мадэрнізацыі прамысловасці СССР.

У сітуацыі крызісу ў 1980-я гт. кіраўніцтва СССР, паводле прыкладу новай эканамічнай палітыкі, звярнулася да рынкавых адносін. У лістападзе 1987 г. М. Гарбачоў адзначыў, што неабходна вярнуць «ленінскую канцэпцыю будаўніцтва сацыялізму» [1, с. 6]. Генеральны сакратар вылучыў ідэю масавага развіцця кааперацыі, якая была выкарыстана ў рабоце У. Леніна «Аб кааперацыі».

Трэба адзначыць, пгго кіраўніцтва партыі і краіны не маіло наўпрост заявіць аб развіцці прадпрымальніцтва. Гэта супярэчыла палажэнням камуністычнай ідэалогіі, якая сцвярджала сацыялістычнае грамадства, забарону эксплуатацыі чалавека чалавекам, адмову ад прыватнай уласнасці і г. д. Таму была выбрана блізкая калектывісцкаму духу ідэя развіцця кааперацыі і іншых форм сумесный працоўнай дзейнасці, пра карысць якіх казаў яшчэ правадыр сусветнага пралетарыяту.

Паводле задумы рэфарматараў, у СССР неабходна было развіваць новыя формы гаспадарання, асабліва ў сферы паслуг і вытворчасці тавараў народнага спажывання, у прыватнасці, прапаноўвалася легалізаваць індывідуальную працоўную дзейнасць, забяспечыць развіццё кааператываў, розных форм арэнды. Першым крокам у гэтым кірунку стала прыняцце ў 1986 г. Закона СССР «Аб індывідуальнай працоўнай дзейнасці», дзякуючы якому ўжо ў 1990 г. 20,5 тыс. грамадзян Беларусі былі заняты індывідуальнай працоўнай дзейнасцю [2, с. 71]. Людзі адчынялі майстэрні, займаліся рамяством, рамонтам.

Але самай знакавай праявай індывідуальнай працы ў пачатку 1990-х гг. стала «чаўноцтва». Ва ўмовах таварнага дэфіцыту, адсутнасці сур'ёзных мытных абмежаванняў і наяўнасці вялікай розніцы ў цэнах паміж суседнімі савецкімі рэспублікамі і блізкім замежжам (адны адпусцілі цэны, а іншыя, як Беларусь, наадварот, іх стрымлівалі) людзі масава пачалі вывозіць тавары за межы сваіх рэспублік. Для многіх у час эканамічнага крызісу гэта стала асноўным прыбыткам.

Беларусь ва ўмовах палітыкі ппучнага стрымлівання цэн цярпела ад вывазу тавараў у суседнія Польшчу і краіны Прыбалтыкі, якія распачалі так званую «шокавую тэрапію». На нарадзе Савета Міністраў Беларускай ССР старшыня ўрада В. Кебіч з горыччу паведамляў: «Мы грабім рэспубліку неверагодна і перш за ўсё ачышчаем прылавак па таварах народнага спажывання. Вывозім сотнямі, тысячамі, дзясяткамі тысяч, вывозім у Прыбалтыку і перапрадаём» [3, арк. 2]. Дзеля прадухілення такой сітуацыі быў прыняты закон «Аб часовых мерах па абароне спажывецкага рынку Беларускай ССР», згодна з якім урад спрабаваў адміністрацыйнымі метадамі вырашыць праблему. Але памежную спекуляцыю магло прадухіліць толькі паступовае выраўноўванне цэн.

Гаворачы пра перабудову і патрэбныя рэформы, М. Гарбачоў неаднаразова заяўляў, што «неабходна развіваць новыя формы сацыялістычнай уласнасці» [4, с. 2]. У поўным сэнсе адраджэнне інстытута прыватнай уласнасці адбылося са станаўленнем і развіццём кааператыўнага руху. У лютым 1987 г. Савет Міністраў СССР выдаў пастанову «Аб стварэнні кааператываў па вытворчасці тавараў народнага спажывання». 26 мая 1988 г. быў прыняты важны заканадаўчы акт «Аб кааперацыі ў СССР», які дазволіў кааператывам займацца любымі незабароненымі відамі дзейнасці, у тым ліку гандлем, а таксама наймаць працоўную сілу. Так быў адкрыты шлях да станаўлення прыватнага сектара эканомікі.

Новы закон не пералічваў забароненых для кааператываў відаў дзейнасці, хаця пэўныя абмежаванні, вызначаныя ўрадам, былі. Акрамя вытворчасці і распаўсюджання зброі, боепрыпасаў, наркотыкаў і ядаў, валютных аперацый, ігральнай дзейнасці, аперацый з каштоўнымі металамі і камянямі, арганізацыі ламбардаў і агульнаадукацыйных школ, пад забаронай знаходзілася навучанне ўсходнім адзінаборствам, вытворчасць і дэманстрацыя кіна- і відэапрадукцыі, выдавецкая дзейнасць. Але нярэдка забароны не працавалі. Праверкі выяўлялі парушэнні амаль у кожным дзясятым кааператыве. Найбольш распаўсюджаным з забароненых відаў дзейнасці быў кінавідэапракат. Гарады хутка ахапіла сетка відэасалонаў, дзе дэманстраваліся замежныя баевікі і эратычныя фільмы. У Мінску ў 1989 г., паводле даных дзяржкантролю, адбываўся «бескантрольны паказ фільмаў, якія культывуюць жорсткасць, гвалт і эротыку» [5, арк. 65].

Кааператыўны рух хутка развіваўся: адчынялася ўсё болын новых прыватных прадпрыемстваў. Як бачна з інфармацыйнай запіскі Пракуратуры БССР, ужо на 1 студзеня 1989 г. у Беларусі дзейнічалі 2518 кааператываў, або 60 % ад зарэгістраваных, якія рэалізавалі прадукцыі і аказалі паслуг на 143 млн руб. [5, арк. 49]. Кааператыўная дзейнасць ахапіла амаль усе галіны народнай гаспадаркі. Калі ж браць пад увагу найбольш распаўсюджаныя сферы дзейнасці, то амаль палову з беларускіх кааператываў складалі будаўнічыя і праектныя арганізацыі. Гэта было звязана з тым, што ў першыя два гады працы згодна з заканадаўствам яны вызваляліся ад выплаты падаходнага падатку. Такі ж ільготны рэжым дзейнічаў у дачыненні да арганізацый па вытворчасці і перапрацоўцы сельскагаспадарчай прадукцыі (акрамя калгасаў).

На працягу некалькіх наступных гадоў назіраўся ўстойлівы рост колькасці кааператываў: за гэты час яна павялічылася болын чым у два разы [2, с. 70]. Найбольш актыўна гэты працэс адбываўся ў Мінску. У год крушэння Савецкага Саюза ў беларускіх кааператывах працавалі 69,6 тыс. чал. (150 тыс. чал. былі задзейнічаны ў іх па сумяшчальніцтве), а аб'ём вырабленай прадукцыі дасягнуў 1,6 млрд руб. [6, с. 29].

Пасля дазволу на дзейнасць кааператываў ва ўмовах пераходу да рынкавай эканомікі назіраўся працэс удасканалення і пашырэння прыватнага сектара. З прыняццем у 1991 г. закона «Аб прадпрымальніцтве ў Беларускай ССР» узніклі новыя віды недзяржаўных суб'ектаў гаспадарання - акцыянерныя аб'яднанні, прыватныя прадпрыемствы і інш. Беларускія прадпрымальнікі нават пачалі аб'ядноўвацца ў свае прафесійныя саюзы. У канцы 1990 г. было створана першае такое аб'яднанне. На пачатку 1992 г. у Беларусі дзейнічалі 4,4 тыс. кааператываў, 3,4 тыс. малых прадпрыемстваў, 155 асацыяцый, 17 канцэрнаў і 2 акцыянерныя таварыствы [6, с. 30].

Але развіццё прыватнага сектара не магло пахіснуць безумоўнага дамінавання дзяржавы ў эканоміцы Беларусі. Калі прадпрымальніцтва і набыло шырокае развіццё, гэта быў толькі малы бізнес, які займаў пэўную нішу (у асноўным невытворчую - гандаль, сферу паслуг). Праблемай было тое, што прадпрымальніцтва не ішло ў рэальны сектар эканомікі. Прыватныя ўласнікі займалі вельмі нязначную долю ў агульным аб'ёме вытворчасці - да канца 1991 г. ён складаў толькі 8,6 % ад агульнага выпуску прамысловай прадукцыі (прычым 8,1 % прыходзілася на арэндныя прадпрыемствы) [6, с. 179].

Яшчэ адной праблемай кааператыўнага руху была скіраванасць яго не на забеспячэнне грамадзян таварамі, а на паразітызм за кошт дзяржаўнага сектара. Як адзначаў В. Кебіч у дакладзе на трынаццатай сесіі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР адзінаццатага склікання, «асноўная маса прадукцыі, вырабляемая кааператывамі, выкарыстоўваецца прадпрыемствамі і арганізацыямі» і не скіравана на забеспячэнне спажывецкіх інтарэсаў насельніцтва [7, с. 16].

Нярэдка прадпрымальніцкая дзейнасць насіла пасрэдніцкі характар. Такая сітуацыя склалася ў выніку ўзнікнення прыватнага сектара, які дзейнічаў па законах рынку, дзе цэны фарміраваліся самастойна, пры адначасовым захаванні дзяржаўнай адміністрацыйна-каманднай сістэмы, дзе яны вызначаліся адміністрацыйным шляхам. Кааператывы скуплялі ў прадпрыемстваў тавары па сабекоштах і прадавалі значна даражэй. У сваю чаргу для дзяржаўных прадпрыемстваў, наадварот, продаж кааператыўнай прадукцыі адбываўся па завышаных цэнах [5, арк. 50]. Нярэдка кааператывы наўпрост ствараліся пры дзяржаўных арганізацыях з мэтай нажывы за кошт спекулятыўных таварна-грашовых аперацый. Спрыяў такому прадпрымальніцтву таварны дэфіцыт.

Праблемы ў кааператыўным руху стварала слаба распрацаваная прававая аснова прадпрымальніцкай дзейнасці. Такая сітуацыя нараджала толькі хаос і бескантрольнасць. У заканадаўстве СССР і саюзных рэспублік доўгі час не быў распрацаваны шэраг пытанняў, якія тычыліся крэдытавання, банкруцтва, правапераемнасці і прававой адказнасці прадпрыемстваў. Напрыклад, кааператывы мелі права на наяўны разлік, што, безумоўна, прыводзіла да бескантрольнага павелічэння грашовай масы ў абарачэнні. На працы прыватнага сектара адбівалася і адсутнасць якога-небудзь вопыту ў саміх савецкіх бізнесменаў, што выражалася, напрыклад, у нізкім узроўні бухгалтарскага ўліку. Праверкі

выяўлялі сітуацыі, калі кааператары не рабілі сацыяльныя адлічэнні ў дзяржфонды. Нават не заўсёды на практыцы дзейнічаў механізм збору падаткаў. Нярэдка месца дзяржавы маглі займаць прадстаўнікі крыміналу.

Масава выяўляліся факты прамога парушэння заканадаўства кааператывамі, самым распаўсюджаным з якіх была пазастатутная дзейнасць. Напрыклад, мінскі гандлёва-закупачны кааператыў «Дары прыроды» скупляў матэрыялы ў магазінах прадпрыемства «Мэбля» і перапрадаваў прадпрыемствам Малдаўскай ССР [5, арк. 50]. У такіх умовах адбываўся працэс росту «ценявога» рынку, гадавы абарот якога ў СССР, паводле афіцыйных даных, за 1990 г. дасягнуў 99,2 млрд руб. [8, с. 50]. У Беларусі, паводле інфармацыі сілавых структур, абарот «ценявога» сектара на 1991 г. склаў больш за 1 млрд руб. Праваахоўным органам тады ўдалося «выцягнуць з ценю» толькі 10 % ад гэтай сумы [9, с. 8]. Пры імклівым пагаршэнні эканамічнай сітуацыі на пачатку 1990-х гг. «ценявы» рынак станавіўся адным з вядучых у эканоміцы ўсяго Савецкага Саюза і БССР у прыватнасці.

Не было дзіўным тое, што насельніцтва Беларусі не заўсёды ветліва ставілася да развіцця новых форм уласнасці і з'яўлення савецкіх бізнесменаў. Згодна з тагачаснымі сацыялагічнымі апытаннямі толькі 52 % рэспандэнтаў падтрымлівалі развіццё прыватных прадпрыемстваў [10, с. 1] і ўсяго 28 % апытаных лічылі, што пашырэнне прыватнай уласнасці і вольнага прадпрымальніцтва можа вырашыць праблему тагарнага дэфіцыту [11, с. 1]. Але трэба адзначыць, што людзі па-ранейшаму знаходзіліся пад уплывам старых ідэалагічных шаблонаў, якія культывавалі адмоўнае стаўленне да багацця і прадпрымальніцтва. Савецкае грамадства было моцна прасякнута ідэямі класавай варожасці.

У часы перабудовы яшчэ болын актыўна, чым кааператыўны рух, развіваліся арэндныя адносіны. У 1990 г. быў прыняты Закон БССР «Аб арэндзе». Да канца 1991 г. у Беларусі дзейнічалі 83 арэндныя прадпрыемствы ў прамысловасці, 123 - у будаўніцтве, 4705 - у гандлі і грамадскім харчаванні, 120 - у бытавым абслугоўванні. 38,9 % аб'ёму паслуг на аўтатранспарце прыпадала на 7 арэндных прадпрыемстваў, па 24 % аб'ёму работ, паслуг, тавараабароту ў будаўніцтве і гандлі [6, с. 30].

Прыватнаўласніцкі сектар пачаў сваё развіццё не толькі ў горадзе, але і ў вёсцы. Ужо з 1 снежня 1988 г. 1922 калгасы і саўгасы выкарыстоўвалі арэндны падрад [12, с. 146], ва ўмовах якога працавалі 90 % брыгад [13, арк. 13]. Шлях да прыватных сялянскіх гаспадарак, арыентаваных на рынак, адкрыў Закон БССР «Аб сялянскай (фермерскай) гаспадарцы». Гэты нарматыўны прававы акт адрадзіў ідэю таварнай сялянскай гаспадаркі, знішчаную яшчэ ў часы калектывізацыі.

У 1990 г. у БССР існавала толькі 17 фермерскіх гаспадарак, праз год у пачатку 1992 г. іх колькасць павялічылася да 757, у сукупнасці яны апрацоўвалі 15 546 га зямлі. Большасць першых фермерскіх гаспадарак знаходзіліся ў Мінскай і Віцебскай абласцях. Трэба адзначыць, што індывідуальнае землекарыстанне існавала не толькі ў форме фермерства. Большая частка беларускага сялянства развівала свае прыватныя прысядзібныя гаспадаркі, да канца так і не ліквідаваныя савецкай уладай па прычыне хранічнага дэфіцыту харчовых тавараў. З 1985 г. колькасць занятых у прыватных прысядзібных гаспадарках паступова павялічылася з 55 да 96 тыс. чал. [6, с. 29-30].

Такім чынам, шляхам развіцця савецкага прадпрымальніцтва і з'яўлення недзяржаўных прадпрыемстваў была закладзена аснова для станаўлення ў Беларусі розных форм уласнасці, існаванне якіх на агульнасаюзным узроўні замацоўваў Закон СССР «Аб уласнасці» ад 6 сакавіка 1990 г.

З улікам агульнасаюзнага заканадаўчага акта ў снежні 1990 г. быў прыняты закон «Аб уласнасці ў Беларускай ССР». Згодна з гэтым нарматыўным прававым актам дзяржава прызнала роўнасць усіх форм уласнасці, якія ўключалі ў сябе прыватную, калектыўную і дзяржаўную (сюды ж уваходзіла ўласнасць іншых дзяржаў і замежных фізічных і юрыдычных асоб, міжнародных арганізацый). Шматукладны характар эканомікі быў прадугледжаны і ў прынятым 14 снежня 1990 г. законе «Аб прадпрыемствах Беларускай ССР». Згодна з дакументам маглі існаваць прадпрыемствы розных форм уласнасці.

Адным з апошніх крокаў беларускага кіраўніцтва стала прызнанне права прыватнай уласнасці на зямлю згодна з пастановай Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 25 кастрычніка 1991 г. *«Аб* прызнанні права прыватнай уласнасці на зямлю на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь».

У часы перабудовы дзяржава рабіла першыя крокі, скіраваныя на прыватызацыю часткі дзяржаўнай маёмасці. У ліпені 1991 г. пабачыў свет Закон СССР «Аб асноўных пачатках раздзяржаўлення і прыватызацыі прадпрыемстваў», які распачаў працэс пераходу дзяржаўнай маёмасці ў прыватныя рукі ў рэспубліках СССР, у тым ліку і ў Беларусі. Ужо да канца 1991 г. тут была завершала праца па прыватызацыі 19 прадпрыемстваў, якія з'яўляліся аб'ектамі рэспубліканскай уласнасці. З іх у акцыянерныя таварыствы былі пераатвораны 3 прадпрыемствы, у калектыўныя - 15. Адно прадпрыемства было прыватызавана па конкурсе [14, с. 30]. З 12,5 тыс. прадпрыемстваў камунальнай уласнасці былі прыватызаваны 33 [15, арк. 36].

Трэба адзначыць, што гэта быў толькі пачатак. Паводле даных камітэта дзяржмаёмасці, уся ўласнасць, якая падлягала прыватызацыі, ацэньвалася ў 56 млрд руб. (для параўнання: вытворчыя фонды

рэспублікі складалі 84 млрд руб.) [16, с. 4]. Але настрой грамадзян Беларусі ў дачыненні да працэсаў раздзяржаўлення быў не такі аптымістычны, як у прадстаўнікоў урада. Так, падчас сацыялагічных апытанняў у 1991 г. толькі 37 % беларускіх рэспандэнтаў выказваліся за неабходнасць прыватызацыі [10, с. 1].

Яшчэ адной формай развіцця прыватнага сектара эканомікі стала прыцягненне замежных інвестыцый, у першую чаргу шляхам арганізацыі прадпрыемстваў з удзелам замежнага капіталу. 13 студзеня 1987 г. Савет Міністраў СССР прыняў пастанову, якая дазволіла стварэнне сумесных прадпрыемстваў. Іm прадстаўляліся ільготныя ўмовы з правам вывазу 80 % прыбытку. Паводле даных урада БССР, да 1990 г. разам з замежнымі фірмамі з ФРГ, Югаславіі, Венгрыі было створана 17 такіх прадпрыемстваў [7, с. 30].

На пачатку 1992 г. былі зарэгістраваны 283 сумесныя прадпрыемствы, на якіх працавалі 10 тыс. чал. [6, с. 30]. Трэба адзначыць, што сумесныя прадпрыемствы былі арыентаваны на больш выгадны для іх імпарт, а не на патрэбны рэспубліцы экспарт і ў асноўным завозілі прадукцыю [2, с. 72].

Такім чынам, у часы гарбачоўскай перабудовы пачало адраджацца беларускае прадпрымальніцтва; адбылося станаўленне недзяржаўнага сектара эканомікі, які заняў значнае месца ў структуры айчыннага рынку. Гэты працэс насіў складаны і даволі супярэчлівы характар. З аднаго боку, прадпрымальніцтва стала адным з лакаматываў перамен, ажывіла ўнутраны рынак краіны, яго дзейнасць была накіравана на ліквідацыю таварнага дэфіцыту. З другога боку, ва ўмовах пераходу да рынкавых адносін пры дамінаванні дзяржаўнага сектара захаванне асноўных элементаў планавай эканомікі адмоўна адбівалася на характары прадпрымальніцтва, якое часцей за ўсё не ішло ў рэальны сектар. Гэта спараджала спекуляцыю і стварала ўмовы для пашырэння «ценявога» рынку. Прыватны сектар, маючы пэўныя перавагі над дзяржаўнай гаспадаркай па ўзроўні свабоды эканамічнай дзейнасці, у той жа час апынуўся ў трохі горшых умовах паводле рэсурснага забеспячэння, магчымасцей распаўсюджання ў многіх сферах эканомікі. Гэта таксама стымулявала пашырэнне ценявых адносін, уключэнне ў іх кааператыўнай і дзяржаўнай гаспадаркі. Перабудоўчае прадпрымальніцтва пры адсутнасці к пачатку 1990-х гг. мінімальна неабходных для яго ўзроўню рынкавых адносін і структур не змагло цалкам раскрыць свой патэнцыял. Але тым не менш дзякуючы пераўтварэнням палітыкі перабудовы ў Беларусі быў закладзены падмурак для станаўлення новай сацыяльна-эканамічнай мадэлі развіцця, якая грунтавалася на свабодзе розных форм уласнасці і развіцці прадпрымальніцтва.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС *(REFERENCES)*


1. *Гарбачоў М. С.* Кастрычнік і перабудова: рэвалюцыя працягваецца : дакл. на сумес. урачыст. пасяджэнні ЦК КПСС, Вярхоўнага Савета СССР і Вярхоўнага Савета РСФСР, прысвеч. 70-годдзю Вялікай Кастр. сац. рэвалюцыі (2 лістап. 1987 г.). Мінск, 1987.
2. СССР в цифрах в 1990 году : кр. стат. сб. М., 1991.
3. Нац. арх. Рэсп. Беларусь. Ф. 7. Воп. 10. Спр. 2003.
4. *Горбачев М. С.* Социалистическая идея и революционная перестройка // Правда. 1989. 26 нояб. С. 8.
5. Нац. арх. Рэсп. Беларусь. Ф. 7. Воп. 10. Спр. 1946.
6. Народное хозяйство Республики Беларусь в 1991 г.: стат. сб. Минск, 1993.
7. Трынаццатая сесія Вярхоўнага Савета Беларускай ССР адзінаццатага склікання (4-5 снеж. 1989 г.) : стэнагр. справаздача. Мінск, 1991.
8. Народное хозяйство СССР в 1990 г.: стат. ежегод. сб. М., 1991.
9. *Дроздов А.* В тени «большого брата» // Рэспубліка. 1991. 14 чэрв. С. 12.
10. Чаго хоча і чаго не хоча беларускі народ // Свабода. 1991. Студзень (№ 1/2). С. 4.
11. Якжыць? Статыстыка// Свабода. 1991. Сакавік (№ 3/4). С. 4.
12. Народное хозяйство Белорусской ССР в 1988 г. : стат. ежегод. сб. Минск, 1989.
13. Нац. арх. Рэсп. Беларусь. Ф. 4п. Воп. 157. Спр. 193.
14. *Губаревич А. С., Криволапое В. В., Матюшевский В. П., Мясникович М. В.* Опыт и проблемы приватизации в Республике Беларусь. Минск, 1992.
15. Нац. арх. Рэсп. Беларусь. Ф. 7. Воп. 12. Спр. 38.
16. Как стать собственником? : интервью пред. Гос. ком. по имуществу В. Матишевского корреспонденту газеты «Рэспубліка» В. Ефанову // Рэспубліка. 1991. 25 чэрв. С. 8.


***Артикул пастypiўурэдтлегiю 02.09.2015.***
***Received by editorial board 02.09.2015.***